## Алімпіядныя заданні па беларускай мове і літаратуры
## XI клас

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

Табліца запаўняецца членамі журы па выніках праверкі заданняў.

Паважаныя ўдзельнікі алімпіяды! Заданні выконваюцца на бланках заданняў. Жадаем Вам поспехаў!

**Заданне 1. Упішыце кожную пару слоў у адпаведную графу табліцы.**

*Абкапаць – абкапаць, вялікі – велічэзны, грубка – групка, звычайны – звычаёвы, знаць – знаць, козка – коска, круціцца – кружыцца, начынка – начынне, піла – піла, прыклад – прыклад.*

| | |
|---|---|
| Сінонімы | |
| Паронімы | |
| Амографы | |
| Амафоны | |
| Амаформы | |

**Заданне 2. Запішыце словазлучэнні, знайшоўшы і выправіўшы памылкі ці недакладнасці ў іх будове.**

Падбаць за дзяцей ________________________________________________,

даведка пра стан здароўя _________________________________________,

пачцівы да старых _______________________________________________,

імунітэт на хваробу ______________________________________________,

зарука для плённага развіцця ______________________________________.

**Заданне 3. Аформіце тэкст у адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі беларускай мовы.**

Старажытная Грэцыя

Кожныя ч__тыры гады ў свяшчэннай мясцовасці Алімпія збіралася многа народ__. Прыходзілі сюды на свята ў гонар бога Зеўса. Статуя Зеўса пакрытая золатам узвышалася ў (А, а) __лімпійскім храме.

Пасля малітвы звернутай да Зеўса пачыналіся спаборніцтв__ бег, бара__ьба, кулачныя баі, гонкі калясніц. Параможца ў спаборніцтвах атрымліваў ва ўзнагароду вянок (с, з) __ галінак дзікай масліны зрэзан__ай залатым нажом. Гэта быў вялікі гонар. Апрануты ў пурпуровае адзен__е параможца ўяз__жаў у родны горад у калясніц__ запрэжан__ай чац__вёркай кон___.

**Заданне 4.** Добра вядомая легенда пра паходжанне бусла, дзе Бог наказвае чалавеку патапіць у балоце мяшок з гадамі, сведчыць, што ва ўяўленні беларусаў устойліва замацавалася асацыяцыя балота з паўзунамі.

У прыведзеным пачатку вершаказа Алеся Разанава падлічыце і запішыце, колькі разоў сустракаюцца гукі, што ёсць у слове *змяя*.

*Максімальная колькасць балаў – **4**.*

Твань – «двань»: у ёй змяшаны, зніtаваны, не разатнуты на дзве паставы, на два «ставы» вада і зямля, світанне і змярканне, і боскае дыханне яшчэ не дакранулася да яе. *(Алесь Разанаў. Твань)*

_______________________________________________

_______________________________________________

_______________________________________________

_____

_______________________________________________

__

_______________________________________________

__

**Заданне 5. Перакладзіце на беларускую мову сказы такім чынам, каб слова *страсть* у кожным выпадку перакладалася іншым сінонімам.**

1. Мало-помалу новое занятие обращается у него в страсть. 2. Вика делала все со страстью. 3. Была у Николая страсть к театру. 4. Его погубила страсть к азартным играм. 5. Про эти места рассказывают страсти. 6. «Страсти по Матфею» – знаменитое музыкальное произведение Баха о Страстях Христовых.

_______________________________________________

_______________________________________________

_______________________________________________

_______________________________________________

_______________________________________________

_______________________________________________

_______________________________________________

_______________________________________________

_______________________________________________

_______________________________________________

_______________________________________________

**Заданне 6. Адзначце сказы з памылкамі ва ўжыванні ступеней параўнання прыметнікаў. Запішыце гэтыя сказы правільна.**

1. Этыкетная паслядоўнасць прывітанняў: маладзейшы вітае старэйшага, мужчына – жанчыну, маладзейшы па чыну – старэйшага. 2. На чале роду стаяў старэйшына – самы стары і паважаны прадстаўнік роду. 3. Самы старэйшы кенійскі школьнік, 88-гадовы Кімані Нганга Маруге, вымушаны быў пакінуць парту і адправіцца ў дом састарэлых. 4. Самы стары храм горада Гродна – Барысаглебскую царкву XII стагоддзя, якую называюць Каложскай царквой або проста Каложай, чакае рэстаўрацыя. 5. Найвышэйшых паказчыкаў па намалоце збожжа дасягнулі Іваноў Алег Анатольевіч, старэйшы камбайнер, і Паграбецкі Аляксей Леанідавіч.

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

**Заданне 7. Дапішыце сказы, якія пачынаюцца з наступных спалучэнняў слоў.**

Не хто іншы ______________________________________________.

Ніхто іншы _______________________________________________.

Нехта іншы ______________________________________________.

**Заданне 8. Замест кропак запішыце ў левы слупок табліцы назвы жывёл ці птушак, каб атрымаліся фразеалагізмы з адпаведным значэннем, указаным у правым слупку.**

| | |
|---|---|
| Падыходзіць як … | бясшумна |
| ісці як … | перавальваючыся |

| | |
|---|---|
| хадзіць як … | павольна, марудна, непаваротліва |
| рушыў як … | нязграбна, няхлямяжна, няспрытна |
| мяняць … на … | дзейнічаць, рабіць неабдумана, неабачліва |
| стрэляны … | вельмі вопытны, спрактыкаваны чалавек |

**Заданне 9. Вызначце па апісанні літаратуразнаўчы тэрмін.**

1. Лірычны верш, прасякнуты сумным настроем – ___________________________.

2. Разнавіднасць метафары, якая заключаецца ў наданні чалавечых уласцівасцей рэчам, прадметам, з’явам прыроды – ________________________________________.

3. Спалучэнне супрацьлеглых разуменняў, якія лагічна выключаюць адно другое, але ўжытыя разам даюць новае паэтычнае ўяўленне – ________________________.

4. Перанясенне ўласцівасцей адной з’явы на другую, чым-небудзь падобную на яе – ________________________________________________________________.

5. Незвычайны парадак слоў у сказе, які дапамагае зразумець ідэю твора і стварае своеасаблівы настрой – _____________________________________________.

**Заданне 10. Развіццё беларускай літаратуры ў пачатку XX стагоддзя характарызуе наступнае (абвядзіце ў кружок літару, якая абазначае правільны адказ):**

а) актывізацыя літаратурна-грамадскага руху і ўздым культурнага будаўніцтва;
б) асаблівая ўвага да рэлігійных каштоўнасцяў;
в) развіццё забаўляльных сцэнічных жанраў – камедый і вадэвіляў;
г) развіццё народнага, самадзейнага, а пасля і прафесійнага тэатра, у выніку чаго было заснавана літаратурнае аб’яднанне “Маладняк”;
д) заснаванне літаратурных аб’яднанняў “Маладняк”, “Полымя”, “Узвышша”;
е) вялікая колькасць перыядычных мультымедыйных літаратурных выданняў;
ж) цэнтрам літаратурнага жыцця з’яўляецца газета “Наша Ніва”;
з) творчы канфлікт паміж маладзейшым пакаленнем літаратараў і пісьменнікамі-класікамі часоў Антычнасці.